STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 1, ROK 2001

*Ганна Саковіч*
*Беласток*

# Вобраз галоўнага героя ў романе Уладзіміра Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні»

Уладзімір Караткевіч лічыцца заснавальнікам гістарычнай раманістыкі ў беларускай літаратуры. Вядома, былі спробы стварэння гістарычнага рамана і да Караткевіча, але ніхто не зрабіў у гэтых адносінах так шмат, як ён. На гістарычным матэрыяле Уладзімірам Караткевічам напісаны вершы, балады, апавяданні, эсэ, п'есы („Званы Віцебска", „Маці ўрагана", „Кастусь Каліноўскі"), аповесці „Дзікае паляванне караля Стаха", „Сівая легенда", „Цыганскі кароль", „Ладдзя роспачы", вядомы пад загалоўкам „Паром на бурнай рацэ" пралог да рамана „Нельга забыць", нарэшце, раманы „Хрыстос прызямліўся ў Гародні" і „Каласы пад сярпом тваім". Непасрэдна звязаны з гісторыяй і апошні буйны твор пісьменніка „Чорны замак Альшанскі".

Варта пагадзіцца з перыядызацыяй творчасці Уладзіміра Караткевіча, якую прапануе Аркадзь Русецкі: першы этап – асэнсаванне жыццядзейнасці беларусаў у познім Сярэднявеччы (раман „Хрыстос прызямліўся ў Гародні", аповесць „Сівая легенда", „Цыганскі кароль", „Ладдзя Роспачы") і другі – адлюстраванне барацьбы роднага народа супраць царскага самаўладдзя ў XIX стагоддзі (раман „Каласы пад сярпом тваім", аповесць „Зброя", апавяданне „Паром на бурнай рацэ")[1]. І абодва гэтыя перыяды з'яўляюцца па-свойму плённымі ў творчым лёсе пісьменніка. У першым перыядзе

[1] А. Русецкі, *Уладзімір Караткевіч, Праз гісторыю ў сучаснасць*, Мінск, 2000, с. 58-59.

найбольшую вядомасць набыў раман Уладзіміра Караткевіча „Хрыстос прызямліўся ў Гародні".

Эмацыянальным штуршком для напісання рамана „Хрыстос прызямліўся ў Гародні" Караткевічу паслужыў запіс з „Хронікі Белай Русі..." Мацея Стрыйкоўскага аб тым, што „на пачатку панавання таго Жыкгімонта Першого быў нейкій ... который з лёгкості якой умысліў або рачэй з роспачы імя із зверхность Хрыста господа собе пріпісаў і прівлашчаў". Гэтыя словы натхнілі фантазію пісьменніка на стварэнне гісторыі прыгод і вандраванняў колішняга шкаляра Юрася Братчыка, які вымушаны быў рабіць „цуды", а пасля ўзначаліў паўстанне супраць „служак" царквы і караля. Антрапацэнтрычнае светабачанне позняга Сярэднявечча – ранняга Адраджэння нарадзіла асоб, здольных на такія ўчынкі. І, як відаць, асобы кшталту, успомненай Мацеем Стрыйкоўскім, адпавядалі светапогляду Караткевіча.

Караткевіч уводзіць чытача ў неспакойнае XVI стагоддзе, паказвае забабоннасць людзей, выяўляе іхнія погляды на жыццё, апавядае пра дзіўныя з'явы (пра цмокаў, прывіды гарадоў і воінскіх рацей у небе, пра падзенне метэарыта, пра лекара, якога каралева Бона ўратавала ад вогнішча, а ён трупы выкопваў і іх трыбушыў).

І вось у такі таямнічы час на беларускай зямлі з'яўляюцца мужчыны так званага „духоўнага звання"[2], разам з якімі едуць жанчыны. Пра езуітаў Караткевіч піша пагардліва і адначасова са шкадаваннем: „Яны былі проста дзеці свайго часу, няшчаснага, хворага, гнойнага, сагнутага, калі чалавек быў амаль жывёлай і толькі сям-там выбіваліся наверх парасткі скарлючанага, але ўпартага і моцнага жыцця" (VI, 23). Так выглядаюць „божыя" служкі, якія праводзяць суд над мышамі. Дзеля ўзмацнення мастацкага эфекту пісьменнік абыгрывае агульны колер іхняга шэрага ўбранства. Гэтым адмоўным вобразам супрацьстаіць галерэя станоўчых герояў, галоўным з якіх з'яўляецца Юрась Братчык – адна ці не з самых любімых раманных постацей Караткевіча.

Дзеянне рамана пачынаецца ў пару, калі ў дзяржаве запанаваў голад. У горад імкнуцца людзі, каб дастаць хоць нейкага харчу. Гародзенская брама, між тым, увесь час паглынае вазы з прадуктамі, якія, аднак, не даходзяць да людзей. Чаму? Народ усведамляе

[2] У. Караткевіч, *Збор твораў у васьмі тамах*, Мінск, 1990, т. 6, с. 13 (Далей спасылкі на гэтае выданне падаюцца ў тэксце. У дужках паказваецца том і старонка).

несправядлівасць існуючага ладу, прагне перамен. Паступова ў горадзе выспявае бунт. І менавіта ў гэты момант, у Гародню, прыходзяць трынаццаць вандроўных акцёраў. Пісьменнік нібы іранізуе са сваіх герояў: „Ішоў, калі разабрацца, самы сапраўдны зброд: аматары выпіць, пад'есці, пераначаваць у чужой адрыне, калі гаспадара няма дома. Ішлі камедыянты, махляры, круцялі, лабатрасы, дагоднікі свайму чэраву, гарэзнікі, насмешнікі" (VI, 66). Аднак пісьменнік верны народнай мудрасці, што не вопратка ўпрыгожвае чалавека, а чалавек вопратку. Відавочна, Уладзімір Караткевіч выкарыстоўвае парадаксальнасць як мастацкі прыём. Гэты стракаты натоўп акажацца здольным на самыя высокія пачуцці і шчырае змаганне за справядлівасць.

На пачатку духавенства прымае Юрася Братчыка (прозвішча галоўнага героя нясе сэнсавую нагрузку, сведчыць пра яго сувязь з народам, дарэчы, у XVI стагоддзі на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага паўставалі праваслаўныя брацтвы і адсюль – Братчык) за ілжэ-Хрыста і хоча яго пакараць. Ды народ бачыць у ім свайго заступніка. І праз нейкі час „служкі царквы", каб выратаваць сваё становішча, выдаюць Юрася Братчыка і яго сяброў за Хрыста і апосталаў, якія павінны выратаваць Гародню ад усіх бед і голаду.

Галоўны герой, як біблейскі Хрыстос, пачынае рабіць „цуды": корміць народ „пяццю хлябамі" і „дзвюма рыбамі", „уваскрашае" п'янага Лазара, ад гандляра індульгенцыямі адбірае грошы, якія раздае бедным, „сляпога" робіць відушчым, выганяе гандляроў з царквы. Народ умацоўваецца ў веры ў свайго мужыцкага Хрыста, што надае Юрасю Братчыку ўпэўненасць, новыя сілы. Вядома, не ўсе прыгоды „Хрыста" і яго „апосталаў" паралеляць з дзеяннямі біблейскага Хрыста. „Цуды" Братчыка-Хрыста былі зямнымі – вынікам і кемлівасці, і махлярства, але цалкам апраўданымі, бо служылі на дабро простаму чалавеку. Насуперак біблейскаму Хрысту Юрась наносіць татарскаму хану ўдар у зубы, калі той гаворыць словы са святога пісання: „Хто ўдарыць цябе ў правую шчаку тваю...". Іншым разам спальвае з сябрамі хату гаспадыні за яе сквапнасць, негасціннасць. Уладзімір Караткевіч, апісваючы з гумарам прыгоды тагачаснага Хрыста і яго апосталаў, паказаў рэнесансавую паўнату жыцця, разняволенне чалавечага цела і духу.

Братчык з'яўляецца постаццю поўнай парадоксаў. На пачатку твора галоўны герой паказаны як чалавек, які вёў не надта працавіты спосаб жыцця. Юрась жыў сам для сябе: ігралі маладыя сілы. Аднак пад уплывам даверанай яму задачы і новых варункаў,

становіцца ён зусім іншай асобай. Аказваецца, што махлярства яго было выпадковым – душа ж яго здольная на самыя высокія пачуцці і да найвялікшага ахвяравання ў імя справядлівасці. Хрыстос-Братчык не карыстаецца сваёй высакароднай роляю для ўласнай выгады. Якраз ён хоча, як мага больш, адпавядаць ёй, таму бярэцца за вывучэнне Бібліі. Аднак Юрасю не ўдаецца знайсці ў Кнізе Кніг адказу на пытанні, што мучаюць яго. І ў ім выспявае намер сустрэцца з чалавекам, які жыве ў Рыме і, пэўна, усё ведае.

Пра светапоглядную трансфармацыю галоўнага героя сведчыць тое, што ён паступова пачынае разумець сваю ролю ў жыцці народа, адчувае непарыўную сувязь з ім. Вось што гаворыць Юрась бурмістру Юстыну: „Быў і я накшталт бязгрэшнага анёла. Глядзеў на ўсё цялячымі вачыма і ўсміхаўся ўсяму. Не разумеў. Пасля махляром быў. Такой свіннёй мяне зрабілі, – ды не, і сам сябе зрабіў! – успомніць страшна. Бог ты мой, якія бяздоні, якое пекла я прайшоў! Але цяпер я ведаю. (...) І ведання свайго ніколі не аддам” (VI, 452). І менавіта гэтае адчуванне сваёй сілы дапамагае яму атрымаць перамогу над татарскім войскам. Слушна сцвярджае Анатоль Верабей, што страты, цяжкасці і няўдачы загартоўваюць мужыцкага Хрыста, што, нягледзячы на ўсе нягоды, гэты герой застаецца аптымістам[3].

У большасці буйных твораў Караткевіча галоўны герой заўсёды штосьці пераймае ад аўтара твора. Постаццю, найбольш роднаснай пісьменніку ў рамане „Хрыстос прызямліўся ў Гародні,” з’яўляецца Юрась Братчык. Для яго, як і для Уладзіміра Караткевіча, галоўнае чалавек з яго непаўторнасцю, унікальнасцю. Самому Караткевічу і яго герою ўласцівы пачуццё чалавечай годнасці і неабходнасці змагання за шчасце простага чалавека, якое пакуль што далёка, але можна яго наблізіць. Такім шчасцем з’яўляюцца свабода думкі і дзеяння, а таксама справядлівасць. Іх духоўны патэнцыял шмат у чым супадае, абодва яны самаахвярныя, гатовыя скласці сваё жыццё на алтар дзеля шчасця іншых людзей, дзеля светлай будучыні. Патрыятызм, вернасць роднаму краю, спачуванне да простага чалавека, арганізуюць характар Юрася Братчыка.

Праз сон мужыцкага Хрыста раманіст выказвае свае утапічныя, не толькі на тамтэйшы час, але і на сённяшні дзень таксама, мары аб ідэальнай Беларусі. Вось якую яе будучыню адкрыў перад Братчыкам Бог Саваоф: „Буслы луналі над багатымі вёскамі, і кожная

---

[3] А. Верабей, *Абуджаная памяць*, Мінск, 1997, с. 180.

вёска была, як пахучы букет. Зямля, уся прыбраная, чыстая (...), гэтая зямля дымела ад сытасці і задаволення (...). Паўсюль былі дастатак і заможнасць (...)” (VI, 466).

Мастак завяршае свой раман сімвалічнай сцэнай: „А сейбіты падымаліся на вяршыню круглага пагорка, як на вяршыню зямнога шара. І першым ішоў насустрач нізкаму сонцу Хрыстос, мерна размахваючы рукамі. І, гатовае да новага жыцця, падала зерне ў цёплую, мяккую зямлю. Выйшаў сейбіт сеяць на нівы свая” (VI, 490). А сяўба гэта сімвалічная. На зямлю падала зерне надзеі, свабодалюбства і чалавечнасці будучага стагоддзя. Зярняты надзеі, што разуменне, да якога прыйшоў Братчык, ніколі не дапусціць ніякага прыгнёту.

Варта пагадзіцца з Вольгай Шынкарэнка, што: „З мэтай духоўнага абуджэння, нацыянальнага самаўсведамлення чалавека канца XX ст. раманіст абірае сваімі героямі этычных максімалістаў, людзей, асвечаных духоўным гарэннем і здольнасцю ахвяраваць сабой дзеля іншых.”[4] А на такую ахвяру Юрась гатовы, што пацвярджаюць яго словы: „Бо калі ты вызначыш мне загінуць, зямля мая, я не буду наракаць” (VI, 411).

Праз паказ рэальных карцін жыцця народа, нязвыклых учынкаў герояў, неверагодных сцэн, сацыяльных кантрастаў, Уладзімір Караткевіч стварыў вобраз позняга беларускага сярэднявечча. Мастацкія характары, створаныя пісьменнікам, сталіся неад’емнаю часткаю духоўнага жыцця беларусаў. Сапраўды, канцэптуальна гэты твор скіраваны не так у гісторыю, колькі ў сучаснасць. „Пісьменнік найперш звяртаецца да сённяшняга беларуса, да яго пачуцця нацыянальнай і чалавечай годнасці”[5].

Раман „Хрыстос прызямліўся ў Гародні” – гэта палатно аб Беларусі XVI стагоддзя. Дзеля ажыццяўлення сваёй задумы, каб глыбей перадаць дух беларускага Сярэднявечча, пісьменнік свядома перастаўляе гістарычныя факты. Аўтар імкнецца стварыць канцэптуальны твор, а не літаральна ўзнавіць мінуўшчыну. Дзеля дасягнення сваёй мэты Караткевіч, акрамя Бібліі, звяртаецца да летапісаў, выкарыстоўвае старыславянізмы, гістарызмы і народныя выслоўі.

Варта ўзгадаць, якім было XVI стагоддзе і якое значэнне мела яно ў гісторыі Беларусі. Менавіта ў гэты час пачаўся новы этап

[4] В. Шынкарэнка, *На скрыжалях гісторыі*, Гомель, 1990, с. 28.

[5] Тамсама.

у гісторыі культуры гэтай дзяржавы, які можна назваць перыядам Адраджэння беларускай літаратуры і мастацтва. Напачатку XVI стагоддзя Францыск Скарына адкрывае друкарню, перакладае на родную мову і выдае кнігі Біблії. Яркім прадстаўніком беларускага гуманізму эпохі Адраджэння быў таксама Мікола Гусоўскі, які ў Рыме стварыў на лацінскай мове патрыятычную паэму „Песня пра зубра". XVI стагоддзе гэтатаксама, на жаль – час кантрастаў. Трагічнае значэнне для Беларусі мелі Люблінская (1569) і Брэсцкая (1596) уніі, якія запачаткавалі заняпад і рэгрэс не толькі беларускай культуры, але і мовы. І невыпадкова, што менавіта, гэты супярэчлівы перыяд зацікавіў Уладзіміра Караткевіча. Можна гаварыць пра тое, што антрапацэнтрызм эпохі Адраджэння шмат у чым адпавядаў светапогляду пісьменніка.

Уладзімір Караткевіч – гонар беларускай літаратуры, пісьменнік, які здолеў раскрыць душу беларускага народа і яго характар. Аб гэтым яскрава сведчыць і раман „Хрыстос прызямліўся ў Гародні" з яго галоўным героем Юрасем Братчыкем.

SUMMARY

The article is devoted to the analysis of one of the most important compositions by Vladimir Korotkievich-a novel "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" which describes complex paradoxical – in the history of Belorussia – the $16^{th}$ century. The transformation of the main hero's outlook on life is discussed. It is concluded that the anthropocentrism of Renaissance was in accordance with Vladimir Korotkievich's outlook on life which is manifested in main hero's features of character similar to the writer's own features.